БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ

ЦЕНТР ПРОБЛЕМ РАЗВИТИЯ ОБРАЗОВАНИЯ

# НАУЧНО-МЕТОДИЧЕСКОЕ ОБЕСПЕЧЕНИЕ УНИВЕРСИТЕТСКОГО ОБРАЗОВАНИЯ

## ИСТОРИЯ И ПЕРСПЕКТИВЫ РАЗВИТИЯ

**Материалы**
**Международной научно-практической**
**интернет-конференции**

**Минск, 26–27 октября 2017 г.**

Минск
Издательский центр БГУ
2017

УДК 378(06)
ББК 74.48я431
Н34

Редакционная коллегия:
*В. В. Самохвал* (ответственный редактор);
*Л. И. Мосейчук, А. В. Барченок, И. Е. Осипчик*

Рецензенты:
доктор психологических наук профессор *Я. Л. Коломинский*;
кандидат социологических наук доцент *М. Г. Волнистая*;
кандидат педагогических наук *М. В. Кудейко*

Н34 **Научно-методическое** обеспечение университетского образования: история и перспективы развития : материалы Междунар. науч.-практ. интернет-конф., Минск, 26–27 окт. 2017 г. / Белорус. гос. ун-т, Центр проблем развития образования ; редкол. : В. В. Самохвал (отв. ред.) [и др.]. — Минск : Изд. центр БГУ, 2017. — 219 с.

ISBN 978-985-553-477-9.

Представлены тексты, отражающие многообразие точек зрения по актуальным вопросам, связанным с научно-методическим обеспечением высшего образования.

Предназначено для менеджеров образования, преподавателей, методологов, аспирантов.

**УДК 378(06)**
**ББК 74.48я431**

**ISBN 978-985-553-477-9**

© Оформление. РУП «Издательский центр БГУ», 2017

# СТАНАЎЛЕННЕ ВЫШЭЙШАЙ ЮРЫДЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ

**Гур'еў С. А.**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск*

У артыкуле разглядаюцца прычыны станаўлення вышэйшай юрыдычнай адукацыі ў БССР пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Апісваецца трансфармацыя і рэарганізацыя вучэбнага падраздзялення, якое займалася падрыхтоўкай юрыстаў у складзе Белдзяржуніверсітэта, адзначаюцца выкладчыкі і выкладаемыя дысцыпліны перыяду станаўлення прававой адукацыі. Пералічаны фактары, якія негатыўна ўплывалі на адукацыйныя і навуковыя працэсы ўніверсітэта. Акцэнтуецца ўвага на пераемнасці юрыдычнай адукацыі ў БДУ.

Ключавыя словы: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, вышэйшая юрыдычная адукацыя.

# FORMATION OF HIGHER LEGAL EDUCATION AT THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY

**Huryeu S. A.**
*Belarusian State University, Minsk*

In the article are considered the reasons of the formation of higher legal education in the Byelorussian SSR after the October Revolution. The transformation and reorganization of the academic units involved in the preparation of lawyers as part of the Belarusian State University are described, the professors and teaching disciplines of formative period of legal education are observed. The factors, negatively affect the educational and scientific processes of the University, are listed. The continuity of legal education at BSU is focused.

Keywords: Belarusian State University, higher legal education.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі колькасць юрыдычных кадраў у савецкай дзяржаве значна скарацілася з прычыны частковай палітычнай міграцыі, судовага і пазасудовага пераследу некаторых прадстаўнікоў дарэвалюцыйнай інтэлігенцыі, чысткі новай савецкай юрыдычнай супольнасці ад былых прадстаўнікоў «варожых класаў» і інш.

Тым не менш, функцыянаванне дзяржавы дыктатуры пралетарыяту, нягледзячы на агульны прававы нігілізм яе ўладаў і распаўсюджанае ў той час у адпаведнасці з панаваўшай канцэпцыяй марксізму аб непазбежнасці адмірання дзяржавы і права пры набліжэнні камунізму, усё ж патрабавала наяўнасці пэўнай колькасці падрыхтаваных прававедаў. Прычым для кіраўніцтва краіны было вельмі важным, каб новыя спецыялісты, якія павінны былі прыйсці на замену «неблаганадзейным старарэжымным» кадрам, западозраным у сабатажы савецкага будаўніцтва і старых чынавенскіх сувязях, былі «савецкімі» па сваіх перакананнях і валодалі «сацыялістычнай правасвядомасцю», бо толькі такія прафесіяналы ў найлепшай ступені адпавядалі б распачатаму працэсу сацыяльнай і ідэалагічнай перабудовы.

Таксама з утварэннем Беларускай ССР і наданнем ёй заканадаўчай кампетэнцыі перад уладамі рэспублікі паўстала пытанне аб неабходнасці падрыхтоўкі ўласных юрыдычных кадраў і адпаведных навуковых школ, патрэбных для распрацоўкі, тлумачэння і прымянення айчыннага заканадаўства.

Нягледзячы на багатую і разнастайную гістарычную прававую спадчыну беларускіх зямель, сістэматычная юрыдычная адукацыя ў перыяд іх знаходжання ў складзе Расійскай імперыі амаль адсутнічала (за выключэннем працы Полацкай акадэміі, зачыненай у 1820 г., і Віленскага ўніверсітэта, ліквідаванага ў 1832 г.). Таму толькі пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў БССР утварыліся ўласныя законатворчыя, прававыя навуковыя і вучэбныя цэнтры, якія супрацоўнічалі і аказвалі ўзаемны ўплыў. Менавіта згаданыя прычыны прывялі да неабходнасці ўтварэння ў БССР уласнай прававой школы, якая б рыхтавала юрыдычныя кадры ў духу сацыялістычнай законнасці і правапарадку.

Першай і да некаторага часу адзінай вышэйшай навучальнай установай краіны, накіраванай у тым ліку на падрыхтоўку правазнаўцаў, стаў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, адчынены ў 1921 г. Універсітэт планавалася стварыць на некалькі гадоў раней, але гэтаму перашкодзілі грамадзянская вайна і вайна з Польшчай. Спачатку ва ўніверсітэце дзейнічала толькі тры факультэты: рабочы, медыцынскі і грамадскіх навук. Факультэт грамадскіх навук з'яўляўся самым буйным, бо на ім навучалася большасць ад агульнай колькасці ўсіх студэнтаў універсітэта.

У сваю чаргу факультэт грамадскіх навук падзяляўся на чатыры аддзяленні: эканамічнае, педагагічнае, этнолага-лінгвістычнае і прававое. У 1921 г. на факультэце адбыўся першы набор абітурыентаў і пачалася падрыхтоўка студэнтаў першага курса. Дэканам факультэта грамадскіх

навук быў прызначаны прафесар У. М. Ігнатоўскі, а з 1922 г. – прафесар С. Я. Кацэнбоген.

Асабовы склад прафесараў факультэта грамадскіх навук быў вызначаны Пастановай Дзяржаўнага вучонага савета ад 9 верасня 1921 г. Для ўсіх аддзяленняў выкладаліся такія агульныя дысцыпліны, як логіка, метадалогія, гісторыя навуковага светапогляду (В. Н. Іваноўскі), гісторыя сацыялізму (І. Я. Герцык), гістарычны матэрыялізм (С. Я. Вальфсон), гісторыя Беларусі (В. М. Ігнатоўскі), Канстытуцыя РСФСР (Г. С. Гурвіч), эканоміка пераходнага часу (В. Г. Кнорын), пралетарская рэвалюцыя (С. З. Кацэнбоген). Акрамя таго, на прававым аддзяленні (сумесна з эканамічным альбо педагагічным) выкладаліся гісторыя народнай гаспадаркі Расіі і Беларусі (У. І. Пічэта), формы гаспадаркі і працы, навука аб фінансах (В. В. Якунін), гісторыя найноўшай Еўропы (В. Н. Перцаў), палітычная эканомія (І. Я. Герцык), гісторыя найноўшай Расіі (Д. А. Жарынаў). Уласнаправавымі дысцыплінамі былі: дзяржаўнае права (Г. С. Гурвіч), тлумачэнне нормаў права (Д. Я. Мейчык). Выкладаліся на факультэце грамадскіх навук і замежныя мовы: англійская, французская, нямецкая і польская [4, с. 13–14].

Паступова колькасць юрыдычных дысцыплін пашыралася, з’яўляліся новыя выкладчыкі. Былі ўведзены дзяржаўнае права буржуазных краін (В. Н. Дурдзянеўскі), судовая псіхіятрыя (М. Б. Кроль), судовая медыцына (І. Т. Цітоў), грамадзянскае права і працэс (М. О. Грэдзінгер), рымскае права (Б. В. Чрэдзін) і інш.

У 1924 г. была ўнесена прапанова аб абмежаванні лекцыйнай сістэмы выкладання як не зусім эфектыўнай. Неўзабаве Народны камісарыят асветы даў указанне аб адмене лекцыйнага метаду выкладання і замене яго семінарскімі, практычнымі заняткамі па прынцыпу лабараторна-брыгаднага метаду. Гэтае новаўвядзенне мела на мэце падрыхтоўку спецыялістаў у найбольш сціслыя, скарочаныя тэрміны: замест чатырох-пяці гадоў – за тры гады [2, с. 6].

Праз чатыры вучэбныя гады ў 1925 г. ва ўніверсітэце упершыню за яго гісторыю адбыўся выпуск адразу 130 юрыстаў. 25 жніўня 1925 г. факультэт грамадскіх навук быў рэарганізаваны ў факультэт права і гаспадаркі, у якім былі вылучаны прававое і эканамічнае аддзяленні. Дэканам новага факультэта быў прызначаны прафесар Сямён Якаўлевіч Вальфсон. Факультэт пачаў сваю працу ў верасні 1925 г. [5].

У 1925/1926 навучальным годзе на ніве падрыхтоўкі юрыстаў працавала ўжо 12 прафесараў: У. І. Пічэта, С. Я. Вальфсон, А. В. Гарбуноў, М. О. Грэдзінгер, В. Н. Дурдзянеўскі, Я. В. Доўнар-Запольскі, С. Я. Кацэнбоген, Н. Н. Краўчанка, Н. А. Прыляжаеў, В. Н. Перцаў, В. Н. Шыраеў, Б. В. Чрэдзін, а таксама шэраг дацэнтаў і асістэнтаў (А. М. Арцымовіч, Ф. І. Гаўзэ, Н. А. Каноплін і інш.) [8, с. 5–6].

Варта адзначыць, што пачынаючы з 1925 г. выкладанне прадметаў, уключаючы юрыдычныя, ва ўсім універсітэце некалькі гадоў ажыццяўлялася

на беларускай мове. Стварэннем і распрацоўкай беларускай юрыдычнай тэрміналогіі займаўся ў тым ліку і супрацоўнік факультэта Ф. І. Гаўзэ [6].

Як сведчаць архіўныя дадзеныя, у навуковым таварыстве БДУ была спецыяльна адкрыта юрыдычная секцыя, на якой актыўна абмяркоўваліся пытанні стварэння і развіцця айчыннага заканадаўства, а таксама адбываліся выступы вядучых юрыстаў па прававой тэматыцы [10].

А. У. Баркоў адзначае, што навукоўцы Белдзяржуніверсітэта сталі піянерамі крыміналагічных даследаванняў у СССР. 30 кастрычніка 1926 г. пры факультэце гаспадаркі і права БДУ быў адчынены Беларускі кабінет па вывучэнню злачынцы і злачыннасці.

Дырэктарам кабінета стаў прафесар А. К. Ленц, які таксама ўзначаліў секцыю крымінальнай псіхалогіі і псіхіятрыі. Другую секцыю Беларускага кабінета па вывучэнню злачынцы і злачыннасці – секцыю крымінальнай сацыялогіі – ўзначаліў прафесар В. М. Шыраеў [3, с. 75–76].

Пастановай СНК Беларускай ССР ад 08.06.1927 г. універсітэту было дадзена права прымаць да абароны доктарскія дысертацыі, а пазней, з увядзеннем у СССР вучонай ступені кандыдата навук, – і кандыдацкія (1934 г.). Пры БДУ была створана аспірантура, якая занялася падрыхтоўкай будучых навукоўцаў і выкладчыкаў.

У 1930 г. факультэт права і гаспадаркі быў перайменаваны ў факультэт савецкага права і будаўніцтва. У 1931 г. факультэт савецкага права і будаўніцтва БДУ быў рэарганізаваны ў самастойны Інстытут савецкага будаўніцтва і права, непасрэдна падпарадкаваны ЦВК БССР, які ў сваю чаргу ў 1932 г. быў трансфармаваны ў Беларускі дзяржаўны юрыдычны інстытут, потым перайменаваны ў Мінскі юрыдычны інстытут. Толькі ў 1954 г. Мінскі юрыдычны інстытут зноў увайшоў у склад Белдзяржуніверсітэта.

Паступова павялічвалася колькасць студэнтаў і выкладаемых дысцыплін. Тым не менш, нягледзячы на сталае штогадовае павелічэнне колькасці дыпламаваных юрыстаў, адкрыццё іншых, акрамя Белдзяржуніверсітэта, вышэйшых навучальных устаноў, якія таксама займаліся падрыхтоўкай юрыдычных кадраў, краіна па-ранейшаму адчувала істотны недахоп высокакваліфікаваных прававедаў. Не дапамагалі нават такія кардынальныя меры, як скарачэнне да 3-х гадоў праграмы навучання па юрыдычных спецыяльнасцях.

Дэфіцыт юрыстаў, які ўтварыўся пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, не быў ліквідаваны нават у 1930-я гады, што вельмі негатыўна адбівалася на народнай гаспадарцы, сістэме кіравання Беларускай ССР, працы праваахоўных органаў і інш.

Так, на спецыяльнай нарадзе пры Інстытуце савецкага будаўніцтва і права Камакадэміі (14–15 красавіка 1934 г.) А. Я. Вышынскі выказваў думку аб неабходнасці павелічэння колькасці студэнтаў-прававедаў утрая. С. М. Гофман, аналізуючы навукова-даследчую працу ў галіне права і пытанні падрыхтоўкі

і перападрыхтоўкі правазнаўцаў у 1930-я гг., нават зрабіў гучную выснову аб «адставанні юрыдычнага фронту ад агульнага развіцця савецкай краіны» [7, с. 145–149].

Нельга не адзначыць, што побач з навучальнай дзейнасцю прафесарска-выкладчыцкі склад універсітэта актыўна займаўся распрацоўкай заканадаўства, аказваючы неабходную дапамогу законатворчым органам маладой рэспублікі, а таксама працаваў і ў навуковым кірунку, што было асабліва важным для ўдасканалення навучальнага працэсу, бо добрых падручнікаў па юрыспрудэнцыі ў той час вельмі бракавала. Сваімі публікацыямі супрацоўнікі БДУ часта запаўнялі той інфармацыйна-адукацыйны вакуум, які існаваў не толькі сярод студэнтаў ВНУ, але і сярод дзейсных супрацоўнікаў дзяржаўнага апарату, у тым ліку і праваахоўнага. У шматлікіх юрыдычных, а таксама і неспецыялізаваных выданнях у той час друкаваліся працы навукоўцаў, якія закраналі найбольш вострыя пытанні па ўсіх галінах тагачаснага права. Займаліся супрацоўнікі ўніверсітэта і прававой асветай сярод шырокіх колаў насельніцтва шляхам правядзення публічных лекцый, выступаў, публікацый у СМІ і інш.

Распавядаючы пра станаўленне і імклівы росквіт юрыдычнай вышэйшай адукацыі ў Белдзяржуніверсітэце, а таксама пра яе дасягненні, на наш погляд, нельга абысці увагай і негатыўныя моманты ў жыцці ўніверсітэта, звязаныя ў першую чаргу з панаваннем марксісцка-ленінскай ідэалогіі і палітычнымі рэпрэсіямі.

Камуністычная ідэалогія, якая паступова апанавала ўвесь універсітэт, разам з асаблівасцямі палітыка-прававога рэжыму тагачаснай дзяржавы прывяла да замацавання ў адукацыі і навуковай дзейнасці ВНУ дагматычных метадаў даследавання, што вельмі негатыўна адбівалася як на якасці навучальнага працэсу, так і на навуковых працах. Свабода навуковай крытыкі і прынцыпы пераемнасці навуковых ведаў амаль адвяргаліся, незалежнасць юрыдычных даследаванняў згортвалася, усялякае іншадумства праследавалася.

Пэўныя навукоўцы публічна выкрывалі адзін у аднаго недастатковую моц камуністычных перакананняў, шальмавалі ў друку апанентаў [1, с. 80]. Іншыя абгрунтоўвалі неабходнасць узмацнення рэспрэсій [9, с. 7–8]. Існавалі шматлікія праявы непедагагічных і ненавуковых, з пункту гледжання сённяшняга часу, паводзінаў выкладчыкаў і навукоўцаў. У той жа час, былі і сумленныя прававеды – абаронцы класічных навукова-педагагічных прынцыпаў, на жаль, многія з іх сталі ахвярамі палітычных рэпрэсій, згадаем іх імёны: У. І. Пічэта, Г. Е. Парэчын, Н. М. Гуткоўскі, В. Д. Дружчыц і інш.

Як бачна, развіццё юрыдычнай адукацыі ў Савецкай дзяржаве, рост колькасці кваліфікаваных юрыстаў і навуковых даследаванняў не дазволіў змяніць правасвядомасць уладаў і папярэдзіць масавыя палітычныя рэпрэсіі 1930-х гг. Гістарычны парадокс заключаецца ў тым, што з развіццём савецкай

юрыдычнай школы каштоўнасць і аўтарытэт права наадварот нівеляваліся, прававая культура зніжалася, прававы нігілізм нарастаў.

Такім чынам, падрыхтоўка юрыстаў у БДУ пачалася адразу з моманту яго заснавання ў 1921 г. Адбывалася паступовае нарошчванне матэрыяльнай, навуковай, прафесарска-выкладчыцкай базы. Структура БДУ ускладнялася. Падраздзяленне ўніверсітэта, якое адказвала за падрыхтоўку прававедаў, увесь час рэарганізоўвалася і пераймяноўвалася. У той жа час, вучэбныя магутнасці вышэйшых навучальных устаноў ў 1920–1930-я гг. не маглі ў поўнай меры задаволіць патрэбы рэспублікі ў кваліфікаваных кадрах, дэфіцыт якіх быў значны. Развіццю навучальнага і навукова-даследчага працэсу перашкаджала ідэалагізаванасць савецкай дзяржавы і палітычныя рэпрэсіі. Нягледзячы на згаданыя негатыўныя моманты, у 1920–1930 гг. у БДУ была закладзена аснова айчыннай вышэйшай юрыдычнай адукацыі, якая шляхам пераемнасці адукацыйнай традыцыі атрымала сваё далейшае развіццё аж да сённяшняга часу.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Бабіцкі, Б. Я. Узмоцнім клясавую пільнасць супроць буржуазнай тэорыі дзяржавы і права: пра работу Галанзы «Псыхалёгічная тэорыя права і марксызм», выд. 1929 г. / Б. Я. Бабіцкі // Бальшавік Беларусі. – 1933. – № 8. – С. 72–80.
2. Балашэнка, С. А. Станаўленне і развіццё прававой школы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта / С. А. Балашэнка // Проблемы развития юридической науки и совершенствования правоприменительной практики : сб. науч. тр. / Белорус. гос. ун-т ; редкол. : С. А. Балашенко (гл. ред.) [и др.]. – Минск, 2005. – С. 4–14.
3. Барков, А. В. Становление школы уголовного права в Белорусском государственном университете / А. В. Барков // Гісторыя і сучаснасць: беларуская дзяржаўнасць ва ўсходнееўрапейскім цывілізацыйным кантэксце : зб. навук. прац, прысвеч. 90-годдзю з дня нараджэння праф. І. А. Юхо / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал. : С. А. Балашэнка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 75–82.
4. Вольфсон, С. Факультет общественных наук Белорусского государственного университета / С. Вольфсон // Вестн. Нар. комиссариата просвещения ССРБ. – 1922. – № 1. – С. 13–14.
5. Вольфсон, С. Я. Факультэт права і гаспадаркі Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту / С. Я. Вольфсон // Працы Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту. – 1926. – № 11. – С. 123–127.
6. Гаўзэ, Ф. І. Да пытання аб беларускай юрыдычнай тэрміналогіі / Ф. І. Гаўзэ // Вес. Нар. камісарыяту юстыцыі Беларус. ССР. – 1927. – № 1. – С. 23–25.

7. Гофман, С. М. Пытанні судовай дзейнасці і навукова-даследчая работа ў вобласці права / С. М. Гофман // Зап. Беларус. акад. навук. – 1934. – Кн. 3. – С. 133–151.
8. Доўнар, Т. І. Зараджэнне айчыннай гісторыка-прававой навукі і яе развіццё ў Беларускім дзяржаўным універсітэце / Т. І. Доўнар // Весн. БДУ. Сер. 3, Гісторыя. Філасофія. Псіхалогія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – 2010. – № 3. – С. 3–9.
9. Лодысев, С. Не либеральничать с летунами и прогульщиками / С. Лодысев // Совет. юстиция. – 1940. – № 15. – С. 7–8.
10. 10. Проект изменений и дополнений Уголовно-процессуального кодекса, проект Особой части Уголовного кодекса БССР (1926 г.) // НАРБ. – Ф. 99. Министерство юстиции (Минюст) РБ. Оп. 2. Ед. хр. 323. – Л. 1–16.